Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

БЕЛАРУСКІ ЗВОН

Радыкальная тыднёвая часопісь.

Цана асобнага нумару 20 гр.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Ліпоўка 18.

Адрэс для карэспандэнцыі і падпіскі: паштовая скрынка № 19.

ПРЫЙМО ІНТЭРЭСАНТАЎ ад 10 да 2 гадз. што-дня, апрача сьвятаў і нядзель.

Падпіска з дастаўкай да хаты: на 1 год — 6 зл., за паўгоду — 3 зл., за 3 мес. — 2 зл., за 1 мес. — 50 гр.

Год I. | Вільня 7 Жвіуня 1931 г. | № 18

У ЧЫМ НАШ РАТУНАК?

Калі Польшча ў канцы XVIII ст. была падзелена паміж трыма суседнімі дзяржавамі і гэтак утраціла сваю дзяржаўную незалежнасьць, — разумнейшыя сыны яе ўсе свае сілы пакіравалі на тое, каб прынамся захаваць сваю нацыянальнасьць, веручы, што пакуль існуе жывы, нацыянальна сьведамы народ, дык нельга губляць веры ў адбудову і сваей дзяржаўнасьці. Блізу паўтара сталецьця Польскі Народ бароўся за захаваньне сваей нацыянальнасьці, творачы вялікае культурнае багацьце ў роднай мове, — і вось на нашых вачох Палякі ня толькі адбудавалі сваё незалежнае гаспадарства, але і заўладалі трацінай Беларусі, куском Літвы, вялікім абшарам Украінскае зямлі ды нават — Нямецкае!

З гэтае навукі гісторыі павінны скарыстаць і мы, Беларусы. І мы мелі некалі сваю дзяржаву, і мы яе ўтрацілі ды нядаўна зрабілі спробу адбудаваць яе. Але спроба наша не ўдалася, і Рыжскім мірам Беларусь аказалася падзеленай на дзьве часткі — Заходнюю пад уладай Польшчы і Усходнюю пад уладай Расеі. І цяпер Народ Беларускі перажывае акурат тое, што пад чужацкай уладай перажывалі йшчэ так нядаўна Палякі. Дык ужываны палякамі спосаб самаабароны, які даў для Польшчы гэткія блiскучыя вынікі, павінен паслужыць узорам і для нас.

Мы мусім напружыць усе нашыя сілы ў кірунку

нацыянальнае самаабароны і тварэньня беларускіх культурных цэннасьцяў.

А дзеля гэтага нам патрэбны кадры

нацыянальна сьвядомае інтэлігенцыі,

якая была-б абаронцай і павадыром Народу, якая тварыла-бы культурнае багацьце ў роднай мове.

Колькі сілаў беларускіх, колькі сыноў нашага Народу і Краю, атрымліваючы адукацыю ў чужацкіх школах, губляе сваю нацыянальнасьць, ідзе ў прымы да чужынцаў і ня толькі працуе над узбагачэньнем іхняе культуры, але і дапамагае ім нішчыць усё роднае — беларускае! А чаму гэтак дзееца? Бо ў нас блізу няма роднае школы, а і тая, якая ёсьць, перажывае пад Польшчай цяжкі крызіс. Аб бурэньні Клецкае гімназіі чытачы нашы добра ведаюць. А ў папярэднім нумары мы зьмясьцілі прост трагічны голас аднаго з ведамых нашых культурнікаў, які алярмуе нашае грамадзянства з прычыны запраўднага разгрому сярод пэдагогічнага пэрсоналу Віленскае і Наваградзкае гімназіяў — з аднachасным пазбаўленьнем іх паловы і без таго невялікае дапамогі з дзяржаўнага скарбу...

Ясна, што на абарону гэтых адзіных установаў, у якіх узгадоўваюцца нашы будучыя інтэлігенты — павадыры Народу і творцы яго культурнага багацьця, павінна падняцца ўсё беларускае грамадзянства, цяпер расьцярушанае палітычнымі сваркамі. Бяз культурнае падставы няма і беларускае палітыкі, і беларускага пытаньня — прынамся пад Польшчай, у якую маскоўскія камуністы, праводзячы нейкую правакатарскую палітыку ў адносінах да Беларусаў, не дапускаюць з Менску ніводнае беларускае навукае кніжкі, «кормячы» нас толькі сваей баламутнай і ашуканскай «бібулай». Масква сьвядома адгарадзіла ад нас нашу культурную скарбніцу ў Менску, каб мы тут хутчэй абясcілелі і нацыянальна памёрлі, а тады — лягчэй будзе ліквідаваць беларускасьць і на Усходзе...

Але

мы паміраць ня хочам — і не памром!

Беларускі Народ, беларускае грамадзянства мусіць

аб'яднацца

ў гэты мамэнт

пад сьцягам абароны нашае нацыянальнасьці і нашых культурных здабыткаў, пад сьцягам творчае культурнае працы.

І толькі дружным, аб'яднаным высілкам мы здолеем абараніць ад упадку існуючыя сягоньня культурныя пляцоўкі і здабываць усьцяж новыя. Мы маем цэлы рад «партыйных» культурна-асьветных арганізацыяў і згуртаваньняў, але кожнае з іх само па сабе ня мае ніякае сілы: «Таварыства Беларускае Школы», апанаванае «змагаццамі», за палітыканства паноў пасло̆ў ёсьць **„unieruchomione"** польскімі ўладамі; «Цэнтрасаюз», які рысаваў сабе шырокі плян працы — чыста культурнае і эканамічнае, гэтак сама **„unieruchomiony"** дзякуючы сумнай ролі, якую ў адносінах да яго адыграў былы ягоны сэкрэтар пан Акіньчыц; а хадэцкі «Інстытут Беларускае Гаспадаркі і Культуры» ня можа выпаўняць сваей шырокай праграмы, бо ня мае сярод сваіх сябро̆ў патрэбнае колькасьці культурных працаўнікоў. Але

тое, што не пад сілу кожнай з гэтых арганізацыяў паасобку, тое было-б пад сілу ўсім разам.

І да аб'яднаньня гэтых арганізацыяў дзеля нацыянальнае самаабароны мы сягоньня адкрыта заклікаем.

Мы ўжо раз казалі аб тым, што ход выпадкаў

прымушае

Беларусаў раней ці пазьней узыйсьці на шлях

агульна-нацыянальнае палітычнае концэнтрацыі,

на шлях тварэньня

адзінага палітычнага фронту.

Але мы разумеем, як цяжка да гэтага дайсьці. Дык пачнем-жа цяпер ад тварэньня прынамся

сталага агульна-нацыянальнага культурнага фронту.

І калі-б тыя беларускія масы, якія былі з'арганізаваны пры Т. Б. Ш., ізноў аб'ядналіся з сваей нацыянальнай інтэлігенцыяй, ад якое іх адарвала камуністычная правакацыя, — дык мы ізноў прадставілі-бы тую магутную сілу, якой Беларусы пад Польшчай былі ў 1926 годзе і раней.

У гэтым — наш адзіны выхад з таго катастрофальнага палажэньня, у якім сягоньня знаходзімся,

РАЗГРОМ БЕЛАРУСКІХ ГІМНАЗІЯЎ.

Клецкай гімназіі, як ужо аб гэтым няраз пісалі мы, Куратарыюм Віленскага Школьнага Вокругу ня дае так званай «канцэсіі» на наступны 31-32 школьны год. Зразумела, што існаваць у Клецку без гэтай канцэсіі ці лепш кажучы дазволу, ніяк нельга, бо калі Стараста ў мінулым годзе падаў у суд Дырэктара Якубёнка за тое, што распачаў заняткі ў гімназіі 4 верасьня, а дазвол з Куратарыюму атрыманы быў толькі 8 верасьня, дык што-ж тут спадзявацца сёлета, калі апублікавана аб канчальнай пастанове школьнай улады — дазволу ня даць. Гэткім чынам *Клецкая гімназія будзе разгромлена канчальна.*

Ня лепш, фактычна, справа стаіць і ў Віленскай ды Наваградзкай гімназіі — тых гімназіях, якія, як быццам, дасталі дазвол на існаваньне (што праўда толькі на адзін наступны год!) ды на'т абяцанку на невялічкую ўрадовую дапамогу.

Гэтыя дзьве Беларускія школы «стукнулі» іншым спосабам — «ня кіем, дык палкаю»: Куратарыюм паведаміла Дырэкцыі гэтых гімназіяў, што не зацьвердзіла на новы 31-32 шк. год наступных вучыцялёў(лях): Луцкевіча Антона, Грышкевіча Вінцука, Ільяшэвіча Мікалая, Банцлебэн Наталю, Ральцэвіча Костуся, Заморына Міхала, Зенкевіча і Орсу. Пры такім палажэньні трудна на'т будзе распачаць заняткі, бо-ж зацьверджаныя полёністкі ды пару іншых вучыцялёў усіх лекцыяў фізычна абхапіць ня здолеюць.

Такім чынам беларускае грамадзянства, ня маючы яшчэ новых вучыцельскіх сілаў, апынулася ў вельмі цяжкіх абставінах — засталося з дзьвюма недабітымі гімназіямі, але бяз вучыцельскага пэрсаналу.

Дык калі нават і ўдалося-б нейк залатаць утвораныя шчарбіны, то гэта выкліча абніжэньне самога роўня навучаньвя. Наступны-ж год, калі падасьпеюць новыя маладыя сілы, ня будзе ўжо да чаго ім прыналежвацца, бо абніжэньне роўня навучаньня можа выклікаць канчальную ліквідацыю і гэтых гімназіяў.

З усяго гэтага вынікае, што ў працягу гэтага году беларускае грамадзянства павінна правясьці такую рэорганізацыю ўсяе свае школьнае палітыкі, якая б забясьпечыла-б нашай моладзі сярэднюю навуку ў роднай мове не залежна ад зьмены настрояў школьнае ўлады.

Калі ў 1926-27 годзе мы здолелі ўтрымліваць пры надзвычайна цяжкіх варунках блізу 70 (67) тайных пачатковых школ, дык зразумела, што зусім лёгка можамо даць сабе рады з пару сярэднімі. Праўда, моладзь гэтых школ ня будзе мець фармальных правоў, але затое будзе мець фактычную веду, а з гэтай апошняй дасьць сабе рады ў жыцьці пры ўсякіх абставінах.

Гэтае пытаньне безумоўна вымагае вялікага напружаньня сіл, а галоўным чынам адзінага беларускага культурнага фронту, але калі ўжо гром грымнуў — дык беларус павінен перахрысьціцца!

А перахрысьціўшыся — дасьць сабе рады, як бы цяжка ня было, як бы чорныя хмары не завалаклі неба! Надзея на тое, што супольнымі сіламі пераможам усялякае ліха, павінна дадаць нам энэргіі і запалу для зьдзейсьненьня вялікае сьвятое нацыянальнае справы!

Валсадар.

ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЬЦЁ.

Польшча.

Тры віцэ-міністры скарбу...

Трэцьцім віцэ-міністрам скарбу мае быць назначаны прафэсар віленск. унівэрсытэту, старшыня віленскай гандлёвай палаты, Завадзкі. Трох віцэ-міністраў яшчэ ня мела ніводнае міністэрства ў Польшчы. Пэўне-ж няма гэтага нідзе на сьвеце. Асабліва дзіўны гэты трэцьці віцэ-міністар скарбу ў часе скарбовага крызісу ў Польшчы дый масавага звальненьня — дзеля ашчаднасьці — урадоўцаў. Прычына тая, што сам міністар скарбу ня мае абсалютна ніякай фаховай веды ў фінансах, маючы толькі ўсяго — папулярнае ў краі імя, бо-ж ёсьць родным братам марш. Пілсудскага.

Выбарныя пратэсты у Найвышэйшым Судзе.

Найвышэйшы Суд назначыў на 5 кастрычніка разгляд пратэстаў проці выбараў у Лідзкім вокрузе, а на 30 лістапада — у Сьвянцянскім.

Менш ядуць ды кураць, але п'юць ня менш у Польшчы!

Паводле даных урадавай статыстыкі — за апошні час значна зьменшылася патрабленьне прадуктаў дзяржаўных манаполяў у Польшчы.

Вельмі значна зьменшылася патрабленьне солі — блізу на пятую частку. Значна менш выручыла дзяржаўная манаполія за тытунь — штосьці на 12 прац. Гэта значыць насяленьне стала менш есьці і курыць.

Толькі вось спажываньне гарэлкі, дык паявілічылася блізу на 12 прац!.. Гэта-ж — вельмі дрэнная характэрыстыка насяленьня, якое тукае забыцьця ў атруце — замест таго, каб шукаць ратунку ў павялічанай працы...

Характэрна адземіць, што адозва Польскай Народнай (сялянскай) партыі, заклікаючая сялянства — ня піць гарэлкі і ня курыць, якая разышлася ў мілёнах экзэмпляраў, пасьля канфіскавалася ўладамі, дый нават за пашырэньне адозвы паліцыя арыштоўвала сяброў партыі дый паасобных сялянаў...

Справа — у тым, што ў гарэлачнай ды тытунёвай манаполях дзяржаўны скарб мае паважныя крыніцы бюджэтных даходаў. Дык заклік апазыцыйнай партыі падрэзаў бюджэтну раўнавагу... Але-ж, з другога боку, — нават сама дзяржаўная сьпіртавая манаполь вялікі грошы, праўда — невялікія, на... прапаганду цьвярозасьці... Та:ія супярэчнасьці — усюдых у краёх, дзе бюджэты — „п'яныя", гэта значыць — пабудаваныя на даходах з гарэлачнай манаполіі.

Заграніцай.

Нямецкі крызіс усьцяж — у цэнтры падзей.

Як ведаюць нашыя чытачы, канфэрэнцыя ў Лёндане, як і ў Парыжу, — у справе ратаваньня Нямеччыны ад фінансавага краху, а вярней: ратаваньня амэрыканскіх ды ангельскіх капіталаў, пазычаных Нямеччыне — кончылася праваламі. Французская прэса страшэнна здаволена была з рэзультатаў Лёнданскіх нарадаў, у якіх Францыя — «паказала сваю сілу».

«Нямеччына цяпер добра ўцяміць сабе, як напружана ды шкодна для яе-ж яе тактыка націску на Францыю праз Амэрыку ды Англію... Нямеччына пераканаецца ізноў, што найлепшы, бадай адзіны шлях яе ратунку, гэта — беспасрэднае паразуменьне з Францыяй... Хай-жа-ж Нямеччына шчыра прызнае слушнасьць французскіх палітычных варункаў, а тады ўсё будзе добра»... Так больш-менш разумавала французская прэса...

Францыя не аблічыла толькі таго, што яе апор на Лёнданскіх нарадах страшэнна разлосьціў проці яе Амэрыканскую ды Англійскую публічную апінію.

Англійскі работніцкі ўрад наагул ня меў ніколі вялікай прыязьні да Францыі, прыхіляючыся выразна да Нямеччыны. А цяпер—злосьць на Францыю, якая сарвала канфэрэнцыю ў Лёндане, кінула англійскіх міністраў яшчэ бліжэй «у абняцьці» Нямеччыны.

27 ліпня англійскі прэм'ер Мак-Дональд з мініст. замежных спраў Гендэрсонам прыбылі ў Бэрлін — з адказнай візытай да нямецкіх міністраў, нядаўна гасьцюўшых у Лёндане. Адначасна прыехаў у Бэрлін і кіраўнік амэрыканскай дыплёматыі Стымсон... Французская прэса пачала біць у званы на трывогу: Рыхтуецца «саюз» Нямеччыны, Англіі ды... Амэрыкі, скіраваны проці Францыі. Жартаваць гневам Амэрыкі ды Англіі, канкуруючы адначасна не на жыцьцё, але на сьмерць з адрадзіўшай ужо бла:у цэлком сваю ваенную сілу Нямеччынай, для Францыі — пры ўсіх яе багацьцях — рэч небясьпечная!..

Гэта ўрэшце добра зразумелі французскія міністры. — Трэба было лагодзіць палажэньне.

Абурэньне ў Англіі проці Францыі ўздымалася таму, што, адмаўляючы дапамагчы фінансава Нямеччыне, Францыя тымсамым — руйнавала англійскую валюту. Бо-ж — побач з уцяканьнем замежных капіталаў з Нямеччыны — наглядаўся шпаркі адлў золата з Англійскага Банку ў Банк Францыі. Залаты запас Англійскага Банку, гарантуючы бязьмежны размен на залатую манэту англійскіх крэдытак, зьмяншаўся ўжо да кры-

Гандлевае паразуменьне Радаў з Францыяй.

Ужо некалькі тыдняў ідуць перагаворы м'ж Францыяй і Радамі. Аб зьмесьце іх хадзілі розныя чуткі, асабліва-ж у нямецкай прэсе, якая страшэнна трывожылася, каб часам Францыя ня вытаргавала ад Радаў чаго забіўчага для Нямеччыны — у родзе прызнаньня польск:х граніцаў ці чаго падобнага іншага... Былі чуткі, бытцам Францыя дае Радам вялізарную пазыку, Рады, з свайго боку, «прызнаюць даўгі царскага ўраду Францыі»...

Цяпер, калі тымчасовы радава - французскі трактат, здаецца, ужо падпісаны, французскі міністар гандлю дакладна высьветліў яго зьмест. Паводле яго заявы — трактат мае выключна гандлёвы характар.

З заявы французскага міністра відаць, як цяжка адбіўся на гандлёвым балянсе Францыі яе «разрыў» з Радамі: мытная «вайна» з Радамі пагражала Францыі 15-міліярдавым недахопам гандлёвага балянсу!..*)

«Вайна», як ведама, распачалася 3-X мінулага году, калі Францыя пачала барацьбу з радавым «дэмпінгам», ці «падрыўным увозам». Барацьба прывяла да зьменшэньня ўвозу з Радаў у Францыю — з 900 міліёнаў франкаў да 600 мілёнаў. Але Рады, з свайго боку, зараз-жа адказалі таксама ўдарам па французскаму ўвозу ў СССР, які ўвоз гэты зьменшылі блізу ў 6 разоў, амаль не зачыніўшы цалком расейскі рынкі для французскіх тавараў. Пачуўшы ўзаемна сілу праціўніка, абедзьве краіны пайшлі на ўступкі. У выніку быў апрацаваны трактат — на падставе раўнавагі тавара-абмену — які адчыніў расейскі рывак для Францыі, а французскі для СССР.

А дзе-ж, можна запытацца, барацьба з бальшавіцкім «падрыўным вывазам», «нявольніцкай працай» і т. д., аб чым так многа пісалася ў французскай прэсе ў прошлым годзе. На гэта даў ясны адказ франц. міністар:

«Ніякага радавага дэмпінгу, заявіў міністар, зусім няма(!): гэта непаразуменьне, дык з ім, але ня з дэмпінгам трэба бароцца!.. Дэмпінг, гэта-ж — збыт заграніцу тавараў таней, іх сабеватрасьці. Але ў дзяржаве, дзе, як у Радаў, дзяржаўная ўлада зьяўляецца сама і фабрыкантам і гандляром (і катам, дадамо ад сябе...), паняцьце цаны ды сабеватрасьці папросту няма (?). Дык няма-ж і дэмпінгу»...

Французскі абаронца радавага дэмпінгу забыў толькі драбязу: у СССР няма запраўды-ж паняцьця «цаны» ці «сабеватрасьці» тавару ўразуменьні клясычнай («буржуазнай») палітычнай эканоміі — якраз таму, што большасьць тавараў выраблены нявольніцкай ці паўнявольніцкай працай — цалком «бясцэннай», ці напалову дармавой...

Новае паразуменьне з Францыяй, трэба прызнаць — вялізарнай перамогай радавага ўраду.

*) Гандлёвы балянс — розьніца паміж вывазам і ўвозам тавараў.

З ПАДАРОЖНЫХ ЗАЦЕМАК.

(Навагрaдчына)

Нарэшце нядоўгія зборы скончаны. Вучнёўская вясёлая моладзь (V кляса) Віленскае Беларускае Гімназіі, пад даглядам кіраўнікоў, вырушае з гучным маршам свайго духавога аркестру ў родную Навагрaдчыну.

Сьвяточная, сонечная раніца...

Малыя фармальнасьці на віленскай станцыі і цягнік, як-бы сьпяшаючыся, адвозіць некалькі дзесяткоў моладзі ў глыб Заходняй Беларусі — Навагрaдак. З вокнаў вагону відаць беларускія нацыянальныя вопраткі вучняў і вучаніц. Ігра аркестру, беларуская песьня і гутарка — зьбіраюць натоўпы падарожных пад вокнамі вагону на праяжджаючых станцыях. Чутно як гэтыя падарожнікі абменьваюцца словамі, скіраванымі ў кірунку экскурсіі: — „Глядзіце, беларусы едуць! „Jak białorusini ładnie grają i śpiewają" і г.д. Чуецца пэўнае зьдзіўленьне, што, нават, беларусы едуць! (Зрэшта гэткае зьдзіўленьне зразумела, бо да беларускіх экскурсіяў вока падарожных ня прывычаілася. Беларускае школьнае моладзі ў Зах. Беларусі вельмі мала, а якая і ёсьць, дык і тая ня шмат падарожнічае з краязнаўча-турыстычнымі мэтамі).

Некалькі гадзінаў дарогі чыгункай уцякае няпрыметна. Праяжджаецца Нёман. Усе прыціхшы высоўваюцца праз вокны, каб зірнуць на родную раку, гэтак прыгожа ўслаўленую беларускімі пісьменьнікамі. — „Ах, які прыгожы Нёман!" — чуецца заўвага вучаніцы. — „Ну й шырыня!" — „Вось дзіва, каб ты паглядзела, які Нёман пад Гродняй, ня так упадабала б" — адказвае вучань-сябра. Зацягваецца вядомая песьня „Эх, ты Нёман, рака!..

Краявід мяняецца. Пачынаецца Навагрaдзкае ўзвышша. Усе ізноў уважна аглядаюць краявід, з якім ужо большасьць тэорэтычна пазнаёмілася на лекцыі Географіі Беларусі. З станцыі Навельня ў Навагрaдак вядзе ўжо вузкакалейка. Праўда, цягнік-ліліпут часта затрымліваецца, як-бы адпачываючы, але затое гэта спрыяе завязцьці гутарку з падарожнымі сялянамі. Чуючы беларускую гутарку моладзі, ня толькі ахвотна з ёй абменьваюцца думкамі даяцькі-беларусы, але й з пад урадавае шапкі выцікаючца паціху беларускія словы. — „Вось малайцы, добра йграеце! — Мусіць у госьці едзеце да Беларускай Навагрaдзкай Гімназіі? — Вось яны Вам запяюць, дык зьдзівіцеся, нават палякі хваляць!— Цягнік рухаецца, а хтосьці з вагону крычыць:— Так, едзем у госьці да Вашых дзяцей, а нашых сяброў. А потым на Сьвітазь — дадае вехта і словы з ветрам лятуць да застаўшыхся сялян...

— Пане вучыцель, Навагрaдак відаць!

— Музыканты, рыхтуйце інструмэнты!

— Дзяўчаты, глядзіце за клумкамі. У вагоне адразу ўсе замітусіліся, бо й запраўды высака на гары паказаўся Навагрaдак — першая сталіца Беларуска-Літоўскага Гаспадарства, руіны замку Мэндоўга і новыя будынкі цяперашняга ваяводзкага места.

Навагрaдак. Вызначыўшы сабе маршрут на возера Сьвітазь, экскурсія ўсё-ж затрымоўваецца ў Навагрaдку і аддаецца на пэўны час да дыспазыцыі гасьцінная Беларускай Навагрaдзкай Гімназіі, яе Дырэкцыі й беларускай мясцовай інтэлігенцыі, якая поўнасьцю выйшла на спатканьне і сталася жычлівым праваднікам па Навагрaдку.

Па кароткім адпачынку і пасілкаваньню, усе разам аглядаюць невялікае, але дарагое кожнаму беларусу, прыгожае места і яго асаблівасьці. Духавы аркестр заваяваў сымпатыю для беларускае экскурсіі ўсіх навагрaдчан, якія тоўпамі праводзяць беларусаў-віленчукоў па вуліцах.

Аглядаем Замковую гару, руіны гістарычнага замку, скуль адчыняецца далёкая пэрспэктыва і навяваюцца дзіўныя думкі і прыгаданьні мінуўшчыны да сучаснасьці. Потым аглядаем „Беларускую бурсу", новапабудаваны яшчэ ня зусім закончаны, будынак з трох павярхаў, вырасшы з ахвяраў сьвядомых беларусаў. Беларускую Гімназію, дзе на часьць прыехаўшых зладжаны быў канцэрт-вечарына.

Карыстаемся з аказіі г. зв. Міцкевічаўскіх урачыстасьцяў і аглядаем даволі цікавую выстаўку, прысьвечаную жыцьцю і творчасьці Адама Міцкевіча. На выстаўцы віднеюцца экспанаты пазычаныя з беларускага Музэю ў Вільні.

Пабыўшы некалькі дзён у Навагрaдку атрымоўваецца аднак ураражэньне, што існуюць два Навагрaдкі. Першы гэта Навагрaдак урадовы, сьвяточны, спакойны, многадакляруючы і толькі; другі — штодзенны, працоўны, жвавы, шчыры і беларускі Навагрaдак. Але для гэтага трэба пабыць у месьце некалькі дзён і асабліва, калі Навагрaдак у рынкавы дзень напаўняе народная беларуская стыхія...

Некалькідзённы пабыт на возеры Сьвітазі (аддегласьць ад Навагрaдка 23 км.); падарожжа з аркестрам праз вёску, дзе пад гукі Лявоніхі настрымоўваліся нават старыя косьці бабулек, усё гэта дапаўняе ўражаньні падарожы. І вось седзючы ў вагоне на паваротнай дарозе да дому, пішучы падарожныя зацемкі і аналізуючы дадатные значэньне краязнаўча-турыстычнай працы і падарожы — мімаволі хочацца пісаць аб тым, як недацэньваецца гэты момэнт у нас Беларусаў.

9.VI.31.

М. І.

тычнага роўня прадбачанага Статутам Банку, а гэта пагражала ўжо крахам англійскай валюты.

Дык вось, Французкі Урад — пасьля перагавораў — згадзіўся даць пазыку Англіі — на падтрыманьне курсу яе «фунта» (манэтная адзінка Англіі вартасьці ў 5 даляраў). Вельмі гэта прыкра было для дзяржаўнага гонару найбагацейшай ды наймагутнейшай калісьці Англіі прасіць, як банкруту, грашовага ратунку ў Францыі, дый яшчэ — таму англійскаму ўраду, які ставіць сабе мэтай — зваліць ваенна-палітычную дыктатуру Францыі ў Эўропе... Але — іншага выхаду ня было: Амэрыка, якая нядаўна дала значную пазыку Англіі, трэбавала, каб Францыя дала палову новай пазыкі, патрэбнай для ратаваньня англійскай валюты.

Урэшце — дайшла да скутку франка-амэрыканская пазыка Банку Англіі — у суме 250 міліёнаў даляраў.

Такім чынам — выбух гневу ў Англіі проці Францыі — за правал лёнданскай канфэрэнцыі,— быў неяк залагоджаны.

Але Францыя моцна стаіць на сваім адносна Нямеччыны: паможа ей фінансава толькі — пад варункам палітычных гарантыяў.

Здавалася-б — Францыя мае ўсялякія гарантыі сваей уласнай бясьпечнасьці — у Лёкарнскіх трактатах (побач з нямецкай і англійская гарантыя ўсходніх граніцаў Францыі!), у сваей арміі, а асабліва ж — у сваім паветраным флёце, у сваіх ваенных саюзах і т. д. Але сталы ўзрост ваеннай сілы і актыўнасьці Нямеччыны ўсьцяж трывожыць Францыю. Французкія «палітычныя варункі» спрытна сформуляваны ў адным толькі пункце: Нямеччына, пакуль ня сплаціць дадзеную Францыяй пазыку (на 5 ць на 10 гадоў), павінна не рабіць ніякіх спробаў ці высілкаў зьмяніць існуючы палітычны лад у Эўропе. Гэты «адзіны» варунак — «палітычнага мараторыуму» на 5-ць на 10 гадоў — узапраўднасьці зьмяшчае ў сябе цэлы рад розных пунктаў, якія французская дыплёматыя раней і пералічвала паасобку.— Тут і адмова ад злучэньня з Аўстрыяй і адмова ад будовы новага браняносца, і зрачэньне перагляду польскіх граніцаў і т. д. Праўда, усё гэта — толькі на 5—10 гадоў. Але Нямеччына, як мы казалі, рашуча адмаўляецца прынцыпова ад усялякіх палітычных варункаў, як абмяжоўваючых яе — роўную з іншымі дзяржавамі — сувэрэннасьць.

Адкідае гэты «адзіны варунак» Францыі Нямеччына й таму, што нават забіўчы для яе Вэрсальскі трактат дае ёй права дамагацца перагляду варункаў трактату (граніцаў і інш), якія зрабіліся для яе нявыканальнымі ці пагражаюць міру... Такім чынам — пасьля стольскіх спробаў беспасрэдніх ці пасрэдніх — праз Амэрыку ды Англію — перагавораў вырашыць справу нямецкага фінансава-палітычнага крызісу — справа гэтая стаіць, як кажуць, «адчыненай» — як вострая пагроза спакою ды міру Эўропы.

Ідзе — лагодная, стрыманная па форме, але страшэнна зацятая па сутнасьці барацьба паміж Нямеччынай і Францыяй, барацьба пакуль што дыплёматычная... Улада — як у Нямеччыне таксама і ў Францыі — знаходзіцца яшчэ ў руках умераных, стрыманых, больш-менш дэмакратычных ды пацыфістычных (проці-ваенных) партыяў... Аднак — ні для каго ня тайна, што як ў Францыі, так асабліва-ж у Нямеччыне да ўлады пруцца дый рвуцца ваяўнічыя нацыяналісты, якія, як дарвуцца да ўлады, дык пэўне-ж наробяць ізноў крывавай кашы ў Эўропе... Дык — вось — перад гэтай небясьпекай усьцяж і стаіць Вэрсальская Эўропа. — Калі ціснуць Нямеччыну надалей, дык трэба ўсьцяж павялічываць ваенную сілу Францыі, умацоўваць яе ваенную дыктатуру ў Эўропе. Але гэта адначасна рыхтавала-б выбух тайна-азброенага ваяўнічага нацыяналізму ў Нямеччыне, большая палова збраеньняў якой рыхтуецца ў бальшавіцкай Расеі!.. Але — з другога боку, як толькі даць волю ды роўнасьць Нямеччыне, дык яна нармальным ходам свайго разьвіцьця хутка дойдзе да таго, што змушана будзе прарваць путы Вэрсальскага трактату, дамагацца новых зямель, звароту калёніяў, разбудовы флёту і т. д... Пераможна канкуруючы на сусьветных рынках з занепадаючай Англіяй і выраджаючайся Францыяй, якая ўжо згары дрыжыць нават цяпер перад напалову спутанай яшчэ вэрсальскімі путамі Нямеччынай...

Дык — як ні павярні — і тут небясьпека і гэтак страшна... А тут яшчэ — камуністычная Расея, як саюзьнік Нямеччыны!...

Праўда — дужа зьменшылася-б небясьпека вайны, калі-б удалося грунтоўна абмежыць збраеньні ўсіх дзяржаваў наагул, але на гэта ня хоча пайсьці першая Францыя, якая — без ваеннай перавагі — ня здолее канкураваць з Нямеччынай ні ў Эўропе, ні на сусьветных рынках. Але ж тое-ж самае і Англія, толькі Англія ня хоча разбраеньня для сябе на моры, а Францыя — на сушы... Ня можна-ж змусіць да разбраеньня і чырвонай Расеі...

Такім чынам — Нямецкі крызіс будзе яшчэ доўга стаяць у цэнтры ўсяго палітычна-гаспадарчага жыцьця Эўропы.

ГРАМАДЗЯНЕ!

Пішыце ў сваю газэту аб жыцьці нашае вёскі і гораду.

Шуміць ясень...

Шуміць ясень шуміць і шуміць,
Жоўтым лісьцем дарогу цярушыць...
Нават ветрык ледзь — чуць шапаціць —
Ясень ужо сваім лісьцем варушыць.
— „Што шуміш гэтак сумна? — спытаў
Яго неяк жабрак падарожны: —
Адкажы мне, як добра згадаў:
Ты, напэўна, як я, брат, набожны?“
Ясень шумам яму адказаў:
— „Памыліўся, жабрача дасужы,
Я малітвы ў жыцьці не шаптаў...
Я сумую — аб долі нядужых“.

В. Шкодзіч.

Скандальны працэс Вальдэмараса у Коуне.

У блізкім часе ў Коўне мае распачацца вялікі працэс, мо' вярней: рад працэсаў былога літоўскага дыктатара Вальдэмараса.

Памятаем, як яшчэ нядаўна гэты былы скромны лектар Петраградзкага ўнівэрсытэту трымаў у жалезным кулаку ўсе літоўскія партыі, усё грамадзянства Літвы, грымеў на ўсю Эўропу, пагражаў... вайной Польшчы, гучэў гадзіннымі прамовамі ў Лізе Нацыяў... Але вось — прышоў і гэтаму «валадару» сумны канец. Калі яго арыштавалі яго-ж найбліжэйшыя прыяцелі, ніхто не крануў пальцам, каб заступіцца за яго. Блізу два гады пратрымалі яго пад арыштам у яго ўласным маёнтачку, а цяпер яго будзе судзіць суд, вярней — аж два суды: звычайны і ваенны. Вінаваціць яго пракуратура цывільная і ваенная — і ў растраце — поруч з былым міністрам скарбу Петрулісам — 30 міліёнаў літаў *) і ў будаваньні з ліпне каштоўных палацаў, і ў купляньні канфіскаваных у палітычных праціўнікаў маёнткаў... З свайго боку, ваенная пракуратура вінаваціць Вальдэмараса ў арганізацыі — поруч з сваімі прыхільнікамі — замаху на жыцьцё былога начальніка літоўскай паліцыі Рустэйкі, сваяка прэзыд. Сьмэтоны, цяпер — міністра ўнутр. спраў.

З свайго боку, і Вальдэмарас, як пішуць газэты, мае на судзе зрабіць скандальныя рэвэляцыі аб тых сваіх былых прыяцелях, якія цяпер судзяць яго, але якія — у часе яго сілы і ўлады — дзяліліся з ім усімі прыемнасьцямі ды выгадамі захопленай улады.. Толькі вось, напружна рыхтуецца Вальдэмарас да гэтых рэвэляцыяў, якія ён ужо зрабіў на дапросе: працэс, як ужо ведама дый зразумела, пройдзе пры зачыненых дзьвярах!..

Як пішуць нават варожыя да Вальдэмараса газэты, працэс мае характар ня столькі судовай, як палітычнай расправы з пабітым праціўнікам: некаторыя пункты абвінавачаньня — яўна сфабрыкаваныя... Але — ці-ж гэта навіна?! Так было, так ёсьць, дый ня толькі ў Літве... На тое працэс і палітычны!

*) 10 літаў — 1 даляр.

У С. С. С. Р.

Як праводзіцца у жыцьцё «новы гаспадарчы курс» Сталіна.

У адным з папярэдніх нумароў мы адзначылі „новы зварот“ у гаспадарчай палітыцы Радаў, які заманіфэставаны гучнай прамовай Сталіна 5 ліпня.

Шмат добрых і разумных рэчаў казаў тады Сталін, каючыся за ўсіх камуністаў у „нарабленых глупствах“. Востра зганіў Сталін, паміж іншым, і так званую „ураўнілаўку“, ім-жа самім уведзеную ў жыцьцё, — загадываючы — наадварот — тасаваць даўнейшую „буржуазную“ сыстэму вышэйшай аплаты працы кваліфікаванага спэцыялісты — работніка.

Але, відаць, слушна зганіць дурніну сваей „сыстэмы“ у вострай прамове ўсемагутнаму дыктатару правадыру камуністычнай дзяржавы аказалася лягчэй, як паправіць наробленыя гэтай „сыстэмай“ глупствы ды беды ў рэальным жыцьці вялізарнай краіны.

Праўду гэтую пацьвярдзіў лёс гэтага загаду Сталіна — аб павышэньні аплаты працы лепшых, спэцыяльных работнікаў.

Пасьля прамовы Сталіна шмат прамысловых прадпрыемстваў сапраўды падвысілі пэнсіі кваліфікаваным працаўніком. Але — зараз-жа атрымалі за гэтае спаўненьне загаду Сталіна востры „наганяй“ ад бліжэйшага яго прыяцеля ды супрацоўніка, старшыні Рады Народнай Гаспадаркі, Орджонкідзэ. Абежнік Орджонкідзэ тлумачыць усім мясцовым гаспадарчым установам, што дрэнны стан радавых фінансаў змушае выконываць загад Сталіна... наадварот! Гэта значыць, што зрабіць розьніцу ў аплаце лепшых і горшых работнікаў, ведама-ж, трэба, але не шляхам дабаўкі пэнсіяў кваліфікаваным работнікам, але — наадварот — шляхам зьмяншэньня пэнсіяў работнікаў — некваліфікаваных...

Трэба добра ўдумацца ў гэтае „разьясьненьне“ Орджонкідзэ да загаду Сталіна, каб зразумець, як цяжка цяпер не на словах, але на дзеле гаспадарча лячыць дый уздымаць зруйнаваны бальшавіцкімі „спробамі“ край.

Кваліфікаваныя работнікі не атрымаюць за свае „кваліфікацыі“, за сваю фаховую веду і працу рэальнага дадатку, але маюць быць „маральна здаволены“ (?) тым, што — „у імя справядлівасьці“ — будзе пагоршана матэрыяльнае палажэньне іх некваліфікаваных таварышоў... — Сумнае пацеха, ад якое пэўне-ж адмовіліся-б лепшыя з іх.

Проці-калгасны тэрор на Радавай Украіне.

З цэлага раду мясцовасьцяў Радавай Украіны йдуць весткі аб забойствах розных камандзіраў ды інструктараў-камуністаў у скалектывізаваных сялянскіх гаспадарках.

Паўстаньне ў Забайкальскім краі.

У цэлым радзе прамысловых раёнаў Забайкальля шпарка шырыцца паўстанчы рух проці бальшавіцкай улады. Урадавыя войскі нясуць у барацьбе вялікія страты — людзьмі і аружжам.

„1 жніўня“ у Польшчы і заграніцай.

Як ведама, бальшавікі, апрача 1 траўня, увялі яшчэ „сьвята“ 1 жніўня.

У гэты дзень работнікі — камуністы павінны асабліва пратэставаць проці падрыхтоўкі новай вайны, асабліва, ведама-ж, — проці паходу з боку буржуазных дзяржаваў на „адзіную сялянска-работніцкую дзяржаву ў сьвеце“.

У зьвязку з гэтым у цэлым радзе местаў Польшчы адбыліся масавыя арышты камуністычных дзеячоў, падрыхтоўваўшых дэманстрацыі.

У Львове арыштавана 80 сяброў камун. партыі. Таксама шмат арыштаў зроблена ў прамысловых раёнах Польшчы. Масавыя арышты ў Варшаўскім ваяводзтве прывялі да поўнай ліквідацыі сеці ком-ячэяк на яго прасторы.

У Станіславове (Галічына) між дэманстраваўшай групай камуністаў і ўланамі дайшло да крывавай сутычкі, у часе якой дэманстранты страляўшыя ў уланаў, былі цяжка пабіты, а 12 з іх арыштаваны.

У зьвязку з 1 жніўня і віленскія камуністы зрабілі спробу мітынгу на рагу Рудніцкай вул. Але, як толькі зьявілася паліцыя, дык ад усяго мітынгу асталося толькі з паўсотні раскіданых лятучак. Пасьля ў розных пунктах места былі затрыманы камун. агенты з літэратурай. Некалькі асоб было арыштавана.

Адначасна было зроблена шмат арыштаў на прастовы Вялейскага, Маладэчанскага ды Ашмянскага пав. Арыштавана 16 асобаў.

Дзякуючы ўсім гэтым сваячасна прынятым мерам, дзень 1 жніўня прайшоў у Польшчы зусім спакойна.

Асаблівыя надзеі ўскладаліся Комінтэрнам на Нямеччыну — у зьвязку з завастрэньнем фінансавага крызісу ў краі. У Лёндане была склікана спэцыяльная нарада кіраўнікоў ком-партыяў англійскай, нямецкай, французкай, польскай і чэха-славацкай, — у мэтах апрацаваньня пляну супольнай ды згоднай дзейнасьці.

Канфэрэнцыя ў Лёндане выдала адозву, у якой заклікала ўсіх работнікаў Эўропы выкарыстаць дзень 1 жніўня — дзеля дэманстрацыяў на карысьць „вызваленьня работніцка-сялянскіх масаў Нямеччыны ад бандыцкага Вэрсальскага трактату“.

У Румыніі — у зьвязку з падрыхтоўкай 1 жніўня — зроблена звыш 600 папераджаючых арыштаў. У Бесарабіі затрымана 4 агентаў Комінтэрну.

Наагул трэба сцьвярдзіць поўны правал гэтага новага „работніцкага сьвята“, ці „дня барацьбы пралетарыяту проці вайны“. Можна быць шчырым праціўнікам вайны, імпэрыялістычнай ці ўсялякай іншай, але якраз таму ня можна спачуваць гэтай „агітацыі проці вайны“ — з боку комінтэрну, які — поруч з радавым урадам — усьцяж рыхтуецца у СССР да вайны ў яе хіба-ж найгоршай, бо-ж найбольш крывавай, жорсткай, дэмаралізуючай і агіднай форме — вайны хатняй.

Колькі грошау вінавата Эуропа Амэрыцы.

Эўрапэйскія дзяржавы вінаваты Амэрыцы ўсяго разам звыш 22 міліярдаў даляраў. З гэтай вялізарнай сумы крыху больш паловы прыходзіцца на долю Англіі. Францыя пазычыла ў Амэрыцы 7 міліярдаў, Італія — 2 з паловай, Бэльгія — 727 міліёнаў. Рэшта дзяржаваў — значна меньш. Маем у віду тутака толькі пазыкі саюзьніцкіх дзяржаваў у часе вайны. Бо-ж паваенныя пазыкі Нямеччыне не ўваходзяць у гэты лік.

Дагэтуль сплата гэтых пазыкаў ідзе страшэнна цяжка. Сплачана дагэтуль усяго толькі паўтара міліярда, дый то — пераважна Англіяй (1 міліярд 200 міліёнаў). Францыя сплаціла толькі 180 міліёнаў. Але з гэтых паўтара міліярда толькі 500 міліёнаў пайшлі на пагашэньне доўгу, а 1 міліярд палічаны Амэрыкай як працэнты.. Дзіва што ня будзе ў Эўропе гаспадарчага ўздыму ды фінансавага ладу, пакуль яна не даб'ецца ад Амэрыкі скасаваньня гэтых ваенных даўгоў, руйнуючых усё гаспадарчае жыцьцё Эўропы, а праз гэта — і прамысловы развой самой Амэрыкі, пазбаўляючы яе згалелага эўрапэйскага рынку для збыту яе тавараў.

Гішпанія.

У рэзультаце рашучых ваенных мераў, ня спыніўшыхся нават перад бамбардыроўкай места, парадак у Сэвільлі адбудаваны. У часе забурэньняў забіта — па афіцыяльных вестках — усяго 10 асобаў, у тым ліку старшыня мясцовых „Сындыкалістаў" (прасьцей — камуністаў). Іншыя весткі кажуць, што забіта звыш 3 дзесяткоў. Арышты ў Сэвільлі прадаўжаюцца. Арыштавана яшчэ 20 асоб, але выпушчана звыш 400 сындыкалістаў, арыштаваных толькі за належаньне да работніцкага працоўнага аб'яднаньня. Барацьба яшчэ ня спынілася, бо-ж група камуністаў зрабіла напад на газавы завод, але была адбіта нацыянальнай гвардыяй. Лічба раненых — звыш паўсотні.

Ваенны суд засудзіў 2 арыштаваных за бунт ды напады на сьмерць. Але ўрад, як пішуць газэты, баіцца выканаць прысуд, бо-ж гэта дрэнна адаб'ецца ў народзе, а, з другога боку — ня можна „выказаць слабасьці ўлады".

Індыя.

Апошнія крывавыя сутычкі паміж індусамі і мусульманамі ў Кашміры адчынілі вочы ўжо і гэтым апошнім: залішне ўжо яўна ды цынічна зроблена была правакацыя з боку англійскіх уладаў. Цяпер уся мусульманская прэса ў Індыі страшэнна абураецца на ўрад — за „такую сыстэму правакаваньня ненавісьці паміж індусамі і мусульманамі"...

Калі гэта ўжо зразумелі індыйскія магамэтане, якія ўсьцяж падтрымлівалі англійскую ўладу проці індускіх незалежнікаў, дык цяпер — недалёкі час, калі гэтыя абодва, дагэтуль варожыя адзін да аднаго народы, на варажосьці якіх якраз англійцы спрытна будавалі сваё панаваньне ў краі, недалёкі, кажам, час, калі гэтыя народы паразумеюцца — на ўзаемную карысьць. А тады — панаваньню англійцаў хутка прыдзе няўхільны канец.

Кітай.

Разгром чырвоных арміяу у Кітаі.

З Шанхаю даносяць, што вялікае наступленьне Чанг-Кай-Шэка проці чырвоных арміяў закончылася вялізарным разгромам апошніх. У 2-тыднёвых баёх забіта 3.000 чырвоных жаўнераў, ранена 10.000, а 25.000 узята ў палон, з якіх 1000 партыйных камуністаў прасстраляна на мейсцы. У рукі ўрадавых войскаў трапіла вялізарная маса гарматаў, кулямётаў, карабінаў дый іншага ваеннага матарыялу.

Кароткія навіны.

— Галоўная Статыстычная Ўправа падлічыла, што за 5 месяцаў бягучага году ў Польшчы збанкрутавала 306 розных гандлёвых фірмаў ды прамысловых прадпрыемстваў. Ведама, што за ўвесь мінулы год збанкрутавала ўсяго 824 прадпрыемствы. Банкруцтвы ня спыняюцца дагэтуль.

— Варшаўскі Дзяржаўны Інстытут Гаспадарчых Дасьледаў падаў вельмі сумныя лічбы, паказываючыя на небясьпечны заняпад сельскай гаспадаркі ў Польшчы, пагражаючы нават — недародам хлеба.

Так — ужыцьцё штучных гнаёў у краі на гэтую вясну зьменшылася больш, як на палову ў параўнаньні з мінулым годам, дый — блізу на тры чэцьвярці, раўнуючы да пазапрошлага году.

— Пасьля 3-дзённых баёў прэзыдэнт Ібанэц зрокся ўлады і ўцёк — з 200 сваіх прыхільнікаў — з краю. Правадыр паўстанцаў Падро Іпата стаў на чале новага ўраду.

ГАСПАДАРЧЫЯ СПРАВЫ.

Калі заворваць іржышча.

У нас звычайна заворваецца іржышча па азімым позьняй восеньню. Тым часам аграномы і гаспадарчыя часопісі ўсьцяж прапануюць, каб пасьля касы ці сярпа зараз жа ішоў плуг і барана.

Карысьці ад сваечаснага плыткага заворваньня іржышча наступныя:

1. Зьберагаецца ў грунце вільгаць і даецца доступ у глебу паветра, без чаго нельга спадзявацца, што ў глебе падгатуюцца пажыўныя матэрыялы для будучага пасеву.

2. Насеньне пустазельля прарастае і потым нішчыцца зімоваю воркаю.

3. Іржышча перагнівае і ўсьцяж утрымліваецца добрая будова глебы.

Аднак няма правіла бяз вынятку. Так і тут. Калі часта варушыць бедныя пяшчаныя глебы, то ня толькі ня будзем мець карысьці, а наадварот, — яшчэ шкоду. У пяскі паветра ды вада і так мае добры доступ, а пажыўныя складнікі, якія вытвараюцца шыбкім перагніваньнем лёгка выпалоскваюцца вадою. Найлепей для бедных пяскоў, калі поля ўвесь час зялёнае. Знача тут вялікае значэньне павінны мець падсяўныя расьліны.

Даглядайма бульбу.

Ня родзіць добра ў нас бульба ня толькі таму, што поле мала гноіцца і не заўсёды добра абрабляецца, але і дзеля таго, што ўжываецца дрэнны пасеўны матэрыял і не вядзецца барацьбы са шкоднікамі.

Дзеля гэтага, трэба ўжо цяпер выбіраць найлепшыя і здаровыя кусты бульбы і азначаць іх калкамі, каб потым выбраць асобна і захаваць на насеньне. Калі будзем мець добры пасеўны матэрыял, то і ўраджаі будуць добрыя.

У разе паяўленьня на бульбяніку чорных плям, а гэта знача, што бульба заражана хваробаю, якая завецца бульбяною гнільлю, трэба тады бульбянік скрапляць бардоскаю жыжкаю. Гэтая апошняя прыгатаўляецца наступным спосабам: распушчаецца ў вадзе 2 кіляграмы сіняга каменя (сярчану медзі) і да гэтае рашчыны дадаецца вапеннае малако ў такой колькасьці, пакуль адстаяўшаяся на паверхні вада ня будзе зусім бескаляровай; пры гэтым трэба мець на ўвазе, што на 2 кіляграмы сіняга каменю павінна выйсьці 100 літраў бардоскай жыжкі.

Як зрабіць добры сыр з звычайнага кіслага малака.

Нашы гаспадыні не заўсёды ўмеюць зрабіць добры сыр. Некаторыя робяць такія сыры, якія потым становяцца цьвёрдымі, як камень.

Найлепшыя сыры атрымліваюцца з сьвежага салодкага малака, але ўмеючы можна і з кіслага малака зрабіць сыр, які будзе так мяккі, як галяндзкі. Робіцца такі сыр наступным спосабам:

Кіслае малако ставіцца ў цёплую печ (не гарачую), а потым, як утворыцца тварог, яго вымаюць з печы, студзяць і зьліваюць у палатняны мяшок, каб сьцякала сыраватка. На другі дзень тварог вымаецца, соліцца і перамешваецца; потым ён раскладаецца ў маленькія мяшочкі, кладзецца на іх чыстая дошка, а на дошку адпаведнае вялічыні камень. Пад такім прэсам сыры павінны ляжаць каля двух дзён. Пасьля гэтага іх вымаюць з мяшочкаў і накрываюць густым палатном. Кожны дзень сыры пераварачваюцца і ляжаць пад палатном так доўга, пакуль не пацягнуцца плесьняй і пакуль ня будзе чуваць востры няпрыемны пах. Гэта настане прыблізна пасьля двух — трох тыдняў. Праз увесь гэты час не павінна быць адчынена памяшчэньне, дзе знаходзяцца сыры.

Пасьля таго, як сыры густа абрастуць плесьняй, палатно здымаецца і пакідаюцца сыры так яшчэ на тыдзень, каб абсохла плесьня.

Далей бярэцца сьвежая сыраватка і падаграваецца да таго ступня, як толькі можа вытрымаць рука і ў такой сыраватцы змываецца рукою плесьня (але не саскрабаецца). Сыраватка часта пераменьваецца і ў ёй мыюцца сыры да таго часу, пакуль зусім ня будуць чыстымі. Пасьля гэтага іх кладуць на палічкі і добра праветрываюць памяшчэньне, каб сыры маглі добра абсохнуць. На гэтым прыгатаўленьне сыроў і канчаецца.

Найлепей перахоўваць такія сыры ў сухім жыце. За дзьве — тры гадзіны перад тым, як сыры ўжыць да яды, трэба іх абмыць у гарачай вадзе і даць крышку абсохнуць.

— Бюджэт Нямеччыны, як можна судзіць па першых месяцах году, пагражае дайсьці да 1 міліярду 200 міліёнаў марак.

— Як даносяць нямецкія газэты, пануючая ў Літве партыя „таўтінінкаў" пастанавіла перарганізавацца на ўзор фашыстаўскай партыі ў Італіі. Мае быць створана Вялікая Рада, у склад якой ўвойдуць прадстаўнікі прамысловасьці, гандлю, земляўласьнікаў, навукі, літэратуры, мастацтва. Рада гэтая мае кіраваць усім дзяржаўным жыцьцём Літвы.

Зразумела-ж — сябры апазыцыйных партыяў ніякімі прадстаўнікамі навукі ды мастацтва, ці эканомікі лічыцца ня будуць. . — На тое-ж і фашызм!

ХРОНІКА

— **Каго яны хочуць ашукаць?** Абшарніцкае „Słowo" зьмясьціла ў № 173 з 31 ліпня с. г. перадавую стацьцю пад назовам „Szkolnictwo białoruskie w Polsce". Сярод розных „адкрыцьцяў" адносна беларускага школьніцтва абшарніцкі публіцыст урачыста заяўляе, што „istnieje wreszcie katedra białoruska przy Uniwersytecie Wileńskim". Вось-жа кожнаму інтэлігенту польскаму ведама, што *ніякае беларускае катэдры пры Віленскім Унівэрсытэце няма,* а ёсьць толькі прыватны *лекторат* д-ра Я. Станкевіча, заданьнем якога ёсьць толькі навучаць слухачоў беларускае мовы, і з унівэрсытэцкай *катэдрай,* якая мае шырокія языказнаўчыя заданьні, лекторат нічога супольнага ня мае і мець ня можа.

Каго вы, паночкі, хочаце ашукаць сваімі „дабрадзействамі" для беларускае культуры? Хіба заграніцу, — бо ў краі ўсім ведама, што „катэдра" беларускае мовы існуе толькі ў выабражэньні рэдакцыі „Słowa", а Беларусы ўжо многа гадоў дарма такое катэдры дабіваюцца...

Сорам, панове!

— **Растраты ды надужыцьці у Горадні і ў Вільні.** У апошнія дні раскрылася некалькі значных растратаў і надужыцьцяў, якія сьведчаць аб маральным заняпадзе грамадзянства. У Горадні арыштаваны начальнік падатковай управы нейкі Моленда, надужыцьці якога пры спагоне падаткаў прычынілі скарбу стратаў блізу на 1 міліён злотых. Разам з гэтым начальнікам пацягнулі да адказнасьці шмат мясцовых купцоў, якія — у змове з ім — фальшавалі гандлёвыя кнігі.

Цікаўна, што гэты Моленда сядзіць на начальніцкім мейсцы толькі некалькі тыдняў, але яго папярэднік нейкі Луба быў таксама арыштаваны за надужыцьці. „Цёплае", відаць, меса...

Нягорш і ў нашай Вільні. Былы віцэ-галава, цяпер лаўнік магістрату Локуціеўскі, гаспадаруючы ў культурна-асьветным (!) аддзеле віленскага самаўраду, „кіраваўшы" і мястовым кінематаграфам, нарабіў розных надужыцьцяў у гаспадарцы апошняга. Газэты пішуць, што пракуратура знайшла шмат розных „памылак" п. Локуціеўскага ў выдатках на гэтую гаспадарку. Характэрна, што на „баданьні" гэты „культурна-асьветны дзеяч" заявіў, што ён — „нічагусенькі не разумее ў кінематаграфічным дзеле", якім узяўся кіраваць...

Вясёленькі ў нас магістрат! — Ня так даўно было голасна сьцьверджана, што „кіруючы" тэхнічнай сэкцыяй магістрату лаўнік Чыж (былы „беларус", і пасьля пэпэсавец) нічога не разумее ў тэхнічных справах, а цяпер тое-ж сьцьвярдзіў сам адносна сябе другі лаўнік, загадчык „культурна-асьветным кінематаграфам" магістрату.

Чаму так дзеецца, гэта — ведама: п. Чыж — дэлегаваны партыяй польскіх сацыялістаў, а п. Локуціеўскі, здаецца, партыяй эндэкаў. Можа, як партыйныя дзеячы, яны абодва й дасканалыя, але партыйная прыналежнасьць, нажаль, не заступіць фаховай веды ды — грамадзкага сумленьня.

— **Спадзяваны няўраджай у Віленшчыне.** Спэцыялісты прадбачаць значны няўраджай жыта ў Віленшчыне, якая не зьбярэ хіба-ж і паловы таго, што мела ў мінулым годзе. Прычына — залішне сьнежная зіма, вымачыўшая шмат-дзе азімыя палеткі. Ізноў у Віленшчыне прыдзецца, як думаюць, дакупляць хлеба дый арганізаваць урадавую дапамогу ў засеўнай кампаніі гэтага году. Трэба ўсім гаспадаром, у якіх зьгінулі азімыя, заявіць аб гэтым загадзя ў гміну, бо-ж рэгістрацыя гэтых стратаў вядзецца пляnova.

— **Акцыя ў справе звальненьня ад кары Б. Кавэрды.** Справай ведамага забойцы радавага пасла ў Варшаве Войкава, Барыса Кавэрды (беларуса) зацікавілася ў апошні час польская й расейская прэса ў Польшчы, дамагаючыся звальненьня яго — у парадку ласкі п. Прэзыдэнта — ад адбываньня кары.

— **Самароспуск рады места Ліды.** Радныя места Ліды зламжылі свае мандаты.

Рэдактар-выдавец: М. СІНЯЎСКІ.

Друкарня А. ДВОРЖЭЦА, Вільня, Завальная вул. № 32.